**УДК 81376:811.161.3**



***© Ала Шубадзёрава***
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь), кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

***© Ala Shubadziorava***
*Associate Professor of the Social and Humanitarian Disciplines dept. of the Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs (Belarus), Ph.D in Philology, Associate Professor*
*e-mail: ashuboderova@mail.ru*

# СПЕЦЫФІКА ПРАВЯДЗЕННЯ ДЫСТАНЦЫЙНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці выкарыстання розных дыстанцыйных тэхналогій у працэсе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Апісваецца тэхналагічны патэнцыял і дыдактычныя магчымасці розных сістэм дыстанцыйнага навучання, якія забяспечваюць фарміраванне і развіццё моўнай кампетэнцыі навучэнцаў.*

У апошні час з’явілася шмат публікацый, у якіх разглядаюцца розныя аспекты дыстанцыйнага навучання, якое зараз актыўна выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе [1–5]. Па-першае, гэта звязана з умовамі пандэміі, якія вымусілі шукаць новыя формы навучання, што дазволілі б выкладчыку і навучэнцу працаваць на аддаленасці. У выніку такой працы традыцыйныя формы былі заменены на дыстанцыйныя з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій на базе глабальнай сеткі інтэрнэт. Па-другое, дыстанцыйнае навучанне замацоўваецца як самастойная форма атрымання вышэйшай адукацыі: на сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь яно выкарыстоўваецца «ў многіх вышэйшых навучальных установах краіны (БДУІР, БНТУ, БДУ, БДЭУ, МІПІСА, БарДУ, ПДУ і інш.)» [1, с. 201].

Аналіз розных адукацыйных сістэм дыстанцыйнага навучання, форм заняткаў (відэалекцыі, відэаканферэнцыі, вэб-заняткі і інш.), прынцыпаў і метадаў дыстанцыйнай адукацыі, відаў дыстанцыйных тэхналогій, рэжымаў арганізацыі адукацыйнай дзейнасці з’яўляецца надзвычай актуальнай задачай, бо дазваляе выявіць як недахопы, праблемы, цяжкасці, так і станоўчыя моманты гэтага віду навучання. Дэталёвы разгляд магчымасцей дыстанцыйнага навучання, абмен метадычнымі

знаходкамі і вопытам правядзення дыстанцыйных заняткаў зробяць працэс пазнання новага больш цікавым і прадукцыйным, забяспечаць правядзенне заняткаў на высокім педагагічным узроўні, будуць садзейнічаць якаснай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў.

Аб’ектам нашай увагі стала дыстанцыйнае правядзенне заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» пры дапамозе розных адукацыйных тэхналогій на базе платформ TrueConf Server і Moodle. Тэхналагічны патэнцыял кожнай з названых платформ спецыфічны не толькі з пазіцыі метадычнай арганізацыі прадметнага навучання, але і з пазіцыі інтэрактыўнага фармату. Паспрабуем выявіць дыдактычныя магчымасці розных сістэм дыстанцыйнага навучання пры выкладанні вышэйназванай дысцыпліны.

«Беларуская мова (прафесійная лексіка)» — дысцыпліна, накіраваная на выпрацоўку і практычнае замацаванне ўменняў і навыкаў граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай; на пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў; на выпрацоўку ўмення практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці; на павышэнне культуры маўлення навучэнцаў.

Галоўная задача данай дысцыпліны — фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, «якая з’яўляецца найважнейшай у іерархіі ўсіх кампетэнцый асобы і <…> інтэгруе асноўныя ўменні, неабходныя для актыўнай дзейнасці ў сучасных сацыякультурных умовах, — моўныя, маўленчыя, уласна камунікатыўныя, інфармацыйныя і агульнакультурныя» [2, с. 171–172]. Неабходна высветліць, якім чынам можна сфарміраваць моўную кампетэнцыю, выкарыстоўваючы варыятыўны набор рэсурсаў і элементаў дыстанцыйнага навучання.

Звернем увагу на асаблівасці вывучэння прафесійнай лексікі ў працэсе правядзенне дыстанцыйных практычных заняткаў на базе адукацыйнай платформы Moodle. Характарызуючы дыдактычны патэнцыял Moodle, многія аўтары публікацый звяртаюць увагу на наступныя перавагі данай платформы ў параўнанні з іншымі:

– даступнасць навучання ў любы зручны час;

– арганізацыю эфектыўнага як дыстанцыйнага, так і вочнага навучання пры дапамозе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

– просты інтэрфейс, модульную структурызацыю вучэбнага курса і лёгкую яго мадыфікацыю;

– сістэматычны маніторынг работы навучэнцаў пры дапамозе прагляду статыстыкі наведванняў і адзнак выканання заданняў, тэстаў і г. д.;

– вялікую колькасць функцыянальных рэсурсаў і інструментаў для арганізацыі дыстанцыйнага навучання і аператыўнай зваротнай сувязі паміж навучэнцам і выкладчыкам;

– магчымасць выкарыстання электронных вучэбных матэрыялаў (даступна, бясплатна);

– многафарматнае размяшчэнне вучэбнага і метадычнага матэрыялу адукацыйнага курса;

– магчымасць выкарыстання розных відаў заданняў, накіраваных на развіццё і фарміраванне моўных і маўленчых уменняў і навыкаў;

– адсутнасць абмежаванняў на колькасць інсталяцый і карыстальнікаў [3–5].

Для эфектыўнай работы на базе адукацыйнай платформы неабходны электронныя вучэбна-метадычныя комплексы (ЭВМК) па названай дысцыпліне. ЭВМК па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» складаецца з некалькіх блокаў:

1) метадычнае забеспячэнне: тлумачальная запіска курса, вучэбная праграма, метадычныя рэкамендацыі, гласарый, спіс літаратуры і іншыя дакументы і інструкцыі, якія садзейнічаюць арганізацыі работы па выкладанню дысцыпліны;

2) матэрыялы для тэарэтычнай падрыхтоўкі. Нягледзячы на тое, што дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» не прадугледжвае правядзенне лекцыйных заняткаў, наяўнасць тэарэтычнай часткі — неабходны элемент данага курса. Размешчаныя матэрыялы дапамогуць навучэнцам падрыхтавацца да практычных заняткаў, выканаць практыкаванні і заданні, пры патрэбе знайсці і паўтараць неабходную інфармацыю;

3) матэрыялы для практычнай работы: электронныя заданні, практыкаванні, якія дазваляюць праводзіць лексічны, арфаграфічны, граматычны трэнінг, выконваць творчыя заданні розных відаў і інш.;

4) матэрыялы для прамежкавага і выніковага кантролю: тэсты, кантрольныя работы, заданні.

Пры распрацоўцы практычных заданняў на базе адукацыйнай платформы Moodle неабходна звяртаць увагу на тое, што знаёмства з новай юрыдычнай лексікай абапіраецца на пэўную метадалагічную сістэму, якая ўключае некалькі этапаў: 1) азнаямленне з лексічнай адзінкай (гукавое і графічнае афармленне, семантыка, граматычныя прыметы); 2) засваенне (замацаванне ў памяці навучэнцаў); 3) выкарыстанне тэрміна ў маўленні.

На першым этапе вывучэння прафесійнай лексікі можна прапанаваць заданні, якія добра зарэкамендавалі сябе пры вочным

навучанні і засталіся эфектыўнымі пры пераносе іх у электроннае асяроддзе сістэмы Moodle: лексічныя практыкаванні (знайсці ў прафесійным тэксце тэрміны, скласці з тэрмінамі словазлучэнні, выбраць лішнія словы з некалькіх прапанаваных, суаднесці слова з адпаведнай катэгорыяй), арфаграфічныя заданні (уставіць прапушчаныя літары ў слове, перакласці тэрміны з рускай мовы на беларускую і запісаць іх) і інш.

Для засваення курсантамі новай лексікі (другі этап) на адукацыйнай платформе Moodle можна выкарыстаць спецыяльна падрыхтаваныя лексічныя практыкаванні: пераклад прафесійных тэкстаў, падбор слоў да прапанаваных дэфініцый, падстаноўку ў тэкст прапушчаных слоў, завяршэнне незакончаных сказаў і тэкстаў і інш.

Пераклад прафесійных тэкстаў — гэта адзін з эфектыўных відаў працы па засваенні прафесійнай лексікі. Ён дазваляе папоўніць слоўнікавы запас навучэнцаў, удасканаліць веды, развіць пісьмовае і вуснае маўленне. Аднак пры дыстанцыйным навучанні студэнты даволі часта звяртаюцца да анлайн-перакладчыка замест таго, каб перакладаць тэксты ці сказы самастойна на аснове атрыманых ведаў. Выкарыстанне такіх перакладчыкаў, натуральна, не спрыяе засваенню лексікі і мовы ў цэлым. Таму пры дыстанцыйным навучанні больш мэтазгодна выкарыстоўваць творчыя віды перакладаў: пераклад-анатацыю, пераказ-пераклад і іншыя, якія патрабуюць індывідуальнага падыходу да выканання заданняў.

Вельмі карыснымі пры азнаямленні і засваенні прафесійнай лексікі з'яўляюцца тэсты, як трэніровачныя, так і кантрольныя, якія дазваляюць не толькі замацаваць новы пройдзены матэрыял, але і пракантраляваць якасць авалодання ім. Аднак праверыць самастойнасць іх выканання пры дыстанцыйнай працы на платформе Moodle немагчыма. Як правіла, студэнты, адказныя, зацікаўленыя ў вывучэнні дысцыпліны, рашаюць тэставыя заданні самі, а нематываваныя ці слаба падрыхтаваныя навучэнцы звяртаюцца па дапамогу да іншых.

Апошні этап засваення прафесійнай лексікі — выкарыстанне тэрмінаў у працэсе камунікацыі — з'яўляецца самым складаным, бо пры рабоце ў Moodle у асноўным пераважае і развіваецца пісьмовае маўленне. На гэтым этапе эфектыўным з'яўляецца выкананне пісьмовага аналізу прафесійных тэкстаў, які ўключае адказ на пытанні па тэксце, каменціраванне тэксту з выкарыстаннем вывучанай лексікі, анатаванне, дапаўненне тэкстаў дадатковай інфармацыяй і інш.

Пры дыстанцыйнай працы на платформе Moodle ўзніклі цяжкасці з фарміраваннем вуснага маўлення навучэнцаў, таму заданні накшталт

вуснага абмеркавання прафесійных тэм, штучнага стварэння маўленчых сітуацый, ролевых гульняў, інтэрв'ю, вусных апытванняў не выкарыстоўваліся. Думаецца, для развіцця моўных камунікацыйных навыкаў больш прыдатнымі з'яўляюцца відэа- і аўдыясродкі навучання.

Складанай задачай для выкладчыка пры дыстанцыйным навучанні з'яўляецца праверка выкананых заданняў, асабліва калі колькасць дасланых работ вялікая і ацаніць іх неабходна ў кароткі тэрмін. Акрамя гэтага, не заўсёды навучэнцы звяртаюць увагу на выпраўленыя выкладчыкам памылкі і імкнуцца высветліць тыя пытанні, якія выклікалі цяжкасці.

Правядзенне практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» з выкарыстаннем платформ TrueConf Server мае сваю спецыфіку ў арганізацыі прадметнага навучання і фарміраванні моўнай кампетэнцыі студэнтаў.

Азнаямленне з прафесійнай лексікай і яе засваенне на практычных занятках у электронным асяроддзі сістэмы TrueConf адбываецца з дапамогай функцыі дэманстрацыі экрана, якая дазваляе паказваць прэзентацыі, відэа і любыя наглядныя матэрыялы. Падчас анлайн-заняткаў можна выкарыстоўваць усе віды заданняў для першага і другога этапаў вывучэння прафесійнай лексікі, што былі апісаны вышэй. Аднак форма работы з практыкаваннямі не пісьмовая, а вусная.

Вуснае выкананне заданняў дае магчымасць выкладчыку каменціраваць адказы навучэнцаў, задаваць дадатковыя пытанні, тлумачыць памылкі, але разам з тым такая праца не дазваляе кантраляваць актыўнасць студэнтаў на занятках. Звычайна з практыкаваннем працуюць адзін ці два студэнты, а іншыя пазбаўлены такой магчымасці і могуць страціць уважлівасць.

Вялікую цяжкасць пры анлайн-рабоце выклікаюць заданні, звязаныя з перакладам слоў, сказаў і тым больш тэкстаў, бо студэнты не заўсёды адразу без выкарыстання слоўніка могуць падабраць правільны адпаведнік пры вусным адказе. Непрыдатнымі для дыстанцыйнай работы на платформе TrueConf з'яўляюцца віды работ, якія звязаны з трэніроўкай пісьмовага маўлення (заданні тыпу: напішыце сказ, дапішыце тэкст, выпішыце з тэксту і інш.).

Несумненна, вельмі важнымі на анлайн-занятках па вывучэнні прафесійнай лексікі з'яўляюцца заданні, накіраваныя на абмеркаванне разнастайных актуальных пытанняў, вусныя апытванні, дыялогі і іншыя, якія дазваляюць выказаць уласнае меркаванне, абгрунтаваць сваю пазіцыю, абменьвацца інфармацыяй. Дыстанцыйнае правядзенне практычных заняткаў у электронным асяроддзі сістэмы TrueConf

у большай ступені садзейнічае развіццю моўных камунікацыйных навыкаў, фарміраванню вуснага маўлення навучэнцаў, чым работа на адукацыйнай платформе Moodle.

Такім чынам, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, якія ўзнікаюць пры працы ў дыстанцыйным рэжыме, неабходна адзначыць, што адукацыйныя платформы TrueConf і Moodle валодаюць выдатнымі дыдактычнымі магчымасцямі для вывучэння дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», бо ствараюць усе неабходныя ўмовы для засваення студэнтамі зместу праграмы, арганізацыі аўдыторнай і самастойнай работы, ацэнкі ведаў падчас выніковага кантролю.

## Спіс асноўных крыніц

1. Шматкова, І. І. Дыстанцыйныя формы навучання ў працэсе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» / І. І. Шматкова // Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития : сб. науч. ст. по материалам I Междунар. науч.-практ. конф., Пинск, 12 апр. 2019 г. / М-во образования Респ. Беларусь [и др.] ; редкол.: К. К. Шебеко [и др.]. — Пинск : ПолесГУ, 2019. — Вып. 1. — С. 198–204.

2. Мартынкевіч, С. В. Камунікатыўная кампетэнцыя як інтэгральная характарыстыка моўнай асобы / С. В. Мартынкевіч // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XV(62) регион. науч.-практ. конф. преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, посвящ. 100-летию со дня основания УО «ВГУ им. П. М. Машерова», Витебск, 3–5 марта 2010 г. — Витебск, 2010. — С. 171–172.

3. Колесова, Т. В. Использование дидактических возможностей электронной образовательной платформы Moodle при обучении иностранному языку студентов неязыковых специальностей / Т. В. Колесова // Материалы IV Регион. науч.-практ. конф. — Йошкар-Ола : МарГУ, 2017. — С. 158–163.

4. Добрынина, Т. И. Перспективы использования виртуальной образовательной платформы Moodle в обучении иностранным языкам / Т. И. Добрынина, О. Г. Масленникова, Е. Ю. Надеждина // Вестн. Кемер. гос. ун-та. — 2014. — № 3 (59), Т. 2. — С. 282–287.

5. Магомедова, Т. И. Электронный учебно-методический кластер в системе дистанционного обучения студентов вуза / Т. И. Магомедова // Педагогический журнал. — 2021. — Т. 11, № 1А. — С. 174–181.

## SPECIFICITY OF REMOTE LESSONS ON THE DISCIPLINE «BELARUSIAN LANGUAGE (PROFESSIONAL VOCABULARY)»

*The article discusses the features of using various distance technologies in teaching the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)». The technological potential and didactic capabilities of various distance learning systems, the achievement of their formation and the development of students' language skills are described.*